


VERTIGO
SUGGESTED FOR MATURE READERS
ISSUE 4
BILL WILLINGHAM
LAN MEDINA
CRAIG HAMILTON
October 2002
2.50
can 4.25
FABLES
DIRECT SALES
vertigocomics.com
ПАДАННІ #4 (2002)
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ
АЛЕНЫ ВАСІЛЬКОВАЙ
BY
COMICS


І ВОСЬ НАСТУПІЎ ВЯЛІКІ ДЗЕНЬ.
САМАЯ ГРАНДЫЁЗНАЯ ПАДЗЕЯ Ў ФЭЙБЛТАЎНЕ. НІБЫ РАЖСТВО І ЧАЦВЁРТАГА ЛІПЕНЯ, ПРЫМНОЖАНАЕ Ў ШМАТ РАЗОЎ.
ГЛАВА ЧАЦВЁРТАЯ
У ЯКОЙ УСЕ ПРЫГОЖА АПРАНАЮЦЦА, ПЕРАКАЗВАЮЦЦА СТАРЫЯ БАЙКІ, А ВОЎК ІДЗЕ ПЛАВАЦЬ.
СЦЭНАР БІЛ ЎІЛІНГХЭМ
АЛОВАК ЛЭН МЕДЗІНА
ЧАРНІЛА КРЭГ ХЭМІЛТОН
ЛЕТЭРЫНГ ТОД КЛЯЙН
КОЛАР ШЭРЫЛІН ВАН ВАЛКЕНБЕРГ
СЕПАР. ЗАЙЛАНОЛ
ВОКЛАДКА ДЖЭЙМС ДЖЫН
АС. РЭДАКТАРА МАРЫЯ ХОХНЭР
РЭДАКТАР ШЭЛІ БОНД
СТВАРАЛЬНІК – Б. УІЛІНГХЭМ
У ПАРАДНЫХ ВАРОТ ДА ЗМЯРКАННЯ.
ЯК І АБЯЦАЎ, КАХАННЕ МАЁ.
ЛЕДЗІ ПРЫГАЖУНЯ, ЛОРД ПАЧВАРА... ЯК ЦУДОЎНА ВЫ ВЫГЛЯДАЕЦЕ! І Я ПЭЎНА БУДУ ІЛГУНОМ, КАЛІ ВЫ СЁННЯ НЕ ВЫГЛЯДАЕЦЕ АБСАЛЮТНА ЧАЛАВЕЧНА, СЭР. МАЕ ВІНШАВАННІ.
ГЭТА МАЯ ЖОНКА. ЯНА ЛЮБІЦЬ УСЁ, ШТО ЗВЯЗАНА З ГЭТЫМ... І МЯНЕ, ДАРЭЧЫ... ДАСТАТКОВА ДЛЯ ТАГО, КАБ ІЗНОЎ ЗРАБІЦЬ МЯНЕ ПРЫГАЖУНЧЫКАМ.
НЕ ПАЧЫНАЙ.




FABLES 4. October, 2002. Published monthly by DC Comics, 1700 Broadway, New York, NY 10019. POSTMASTER: Send address changes to FABLES, DC Comics Subscriptions, P.O. Box 0528, Baldwin, NY 11510. Annual subscription rate $30.00. Canadian subscribers must add $12.00 for postage and GST. GST # is R125921072. All foreign countries must add $12.00 for postage. U.S. funds only. Subscriptions to this title are offered only to readers who attest they are 18 years of age or older, or with written parental approval to readers under 18 years of age.
Printed in Canada.

DC Comics. A division of Warner Bros.–An AOL Time Warner Company


ДАЎНЫМ-ДАЎНО БЫЛІ ТЫСЯЧЫ КАРАЛЕЎСТВ, РАСКІДАНЫЯ ПА СОТНІ І БОЛЕЙ ЧАРОЎНЫХ СУСВЕТАЎ.
МЫ БЫЛІ КАРАЛЯМІ І ШАЎЦАМІ.
ЧАРАЎНІКАМІ І ЦЯСЛЯРАМІ.
У НАС БЫЛІ СВАЕ ГРЭШНІКІ І СВЯТЫЯ. І СВАЕ, ЯКІЯ НАРОВІЛІ УЛЕЗЦІ ВЫШЭЙ.
І АД НАЙВЯЛІКШАГА ЛОРДА ДА ПРОСТАЙ СЯЛЯНКІ МЫ БЫЛІ ПРОСТА НЕЗНАЁМЦАМІ ДА АДЗІН АДНАГО.



КАБ АБ'ЯДНАЦЬ НАС, ПАТРАБАВАЛАСЯ УВАРВАННЕ.





"ЗА САМЫМІ ДАЛЁКІМІ КУТКАМІ НІЧОГА, У АДДАЛЕНЫМ КАРАЛЕЎСТВЕ ЖЫЎ ВОРАГ, ПАКІНУТЫ ЎСІМІ, ПАКУЛЬ СТАГОДДЗЯМІ РАСЛІ ЯГО МОЦ І АМБІЦЫІ.
АДНЫ КАЖУЦЬ, ШТО ЁН БЫЎ ПРОСТЫМ ЛЯСНЫМ ДУХАМ, ДРУГІЯ СЦВЯРЖАЮЦЬ, ШТО ЁН АДНОЙЧЫ БЫЎ БОГАМ...
"...ЗРЫНУТЫМ З БЯСКРАЙНІХ НЯБЁСАЎ, КАЛІ ЯГО ЗАГАННАСЦЬ СТАЛА ЗАНАДТА ВЯЛІКАЙ ДЛЯ ЦЯРПЕННЯ ЯГО ВЕЛІЧНЫХ ПАБРАЦІМАЎ.
ЯКІМ БЫ НІ БЫЛО ЯГО САПРАЎДНАЕ ПАХОДЖАННЕ, ЁН ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў ЦЁМНУЮ ВЕЧНА ГАЛОДНУЮ СУТНАСЦЬ.
І ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ЁН ЗАВАЯВАЎ УЛАСНЫЯ ЗЕМЛІ, ЗАБІЎ КОЖНАГА З БЫЛЫХ КАРАЛЁЎ, ЁН ЗВЯРНУЛ СВАЕ НЕПАМЕРНЫЯ АПЕТЫТЫ У НАШЫМ НАКІРУНКУ.
КАЛІ СМАРАГДАВАЕ КАРАЛЕЎСТВА ЎПАЛА, МЫ ЗАБУРЧАЛІ І ПАЧАЛІ АБУРАЦЦА...
...АДЧУВАЯ СМУТАК ЗА ЛЁС ТЫХ НЯШЧАСНЫХ ДУШ, АЛЕ МЫ НЕ ЖАДАЛІ УЦЯГВАЦЦА.
ЗРЭШТЫ РЭШТ, ЯНЫ ЗАЎСЁДЫ БЫЛІ ДЗІЎНЫМ НАРОДЦАМ.
ГЭТА БЫЛА НЕ НАША СПРАВА.


"ПОТЫМ УПАЛА КАРАЛЕЎСТВА ВЯЛІКАГА ІЛЬВА, І ІЗНОЎ МЫ НІЧОГА НЕ ЗРАБІЛІ, БО ЗАЎСЁДЫ ЛІЧЫЛІ, ШТО НА НАШ ГУСТ СТАРЫ ЛЕЎ БЫЎ НАПЫШЛІВЫМ І ЗАНАДТА КУРЧЫЎ З СЯБЕ СВЯТОШУ.
АДНА ЗА ДРУГОЙ, НАШЫ РАЗ'ЯДНАНЫЯ ЗЕМЛІ ПАЙШЛІ ПАД УЛАДУ ВОРАГА, ПРАГЛЫНУТЫЯ ІМПЕРЫЯЙ, ЯКАЯ ПАВЯЛІЧВАЛАСЯ І ПАВЯЛІЧВАЛАСЯ. МЫ МАГЛІ Б СПЫНІЦЬ ЯГО, КАЛІ Б АБ'ЯДНАЛІСЯ РАНЕЙ.
АЛЕ КАЛІ МЫ ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО ЁН НЕ ТОЛЬКІ ЖАДАЎ ЗАХАПІЦЬ ТУЮ ЗЕМЛЮ АБО ТЫХ ЛЮДЗЕЙ... ШТО ЁН ПРЫЙШОЎ ЗА ЎСІМІ НАМІ... БЫЛО ЗАНАДТА ПОЗНА.
ЁН СТАЎ ЗАНАДТА МОЦНЫ.
У ШМАТ КАГО З НАС НЕ БЫЛО АНІ ШАНЦУ СХАВАЦЦА."


НЕКАТОРЫЯ З НАС ВЫЖЫЛІ, АЛЕ ТОЛЬКІ НЕКАТОРЫЯ. У АДЗІНОЧКУ ЦІ МАЛЕНЬКІМІ ГРУПАМІ НА ПРАЦЯГУ МНОГІХ ГАДОЎ... ЖЫЦЦЯЎ... МЫ ХАВАЛІСЯ І БЕГЛІ АД ПЛЕНУ.
МЫ ЖЫЛІ ЯК ЗЛАЧЫНЦЫ І ПРЫВІДЫ.
ПАКУЛЬ МЫ НЕ ЗМАГЛІ ДАЙСЦІ СЮДЫ, У НУДНЫ МІР ЗВЫЧАЙНЫХ. АДЗІНЫ МІР, ЯКІ НЕ ЦІКАВІЦЬ ВОРАГА.
ПАКУЛЬ МЫ НЕ ЗМАГЛІ ДАЙСЦІ СЮДЫ, У НУДНЫ МІР ЗВЫЧАЙНЫХ. АДЗІНЫ МІР, ЯКІ НЕ ЦІКАВІЦЬ ВОРАГА. І ТУТ, АБ'ЯДНАНЫЯ АГУЛЬНЫМ ВОРАГАМ...
І ТУТ, АБ'ЯДНАНЫЯ АГУЛЬНЫМ ВОРАГАМ, МЫ НАВУЧЫЛІСЯ ЗАБЫВАЦЬ СТАРЫЯ КРЫЎДЫ. МЫ ПРАБАЧЫЛІ ШМАТ НАШЫХ КРЫЎД, КАБ ДАМОВІЦЦА.
І ЗАРАЗ ДРАПЕЖНІК І АХВЯРА, ПРЫНЦ І ЖАБРАК – МЫ ЎСЕ АДНА СУПОЛЬНАСЦЬ...
...АБ'ЯДНАНАЯ НАШАЙ НЕЗГАСАЛЬНАЙ ПАМЯЦЦЮ ПРА РОДНЫЯ ЗЕМЛІ І НЯЗЛОМНАЙ УПЭЎНЕНАСЦЮ, ШТО МЫ АДНОЙЧЫ ВЕРНЕМСЯ, КАБ ВЫЗВАЛІЦЬ ЗЕМЛІ АД НЕНАВІСНАГА.


СПАДАРСТВА, ПАДНІМІЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, КУФЛІ І ВЫП'ЕМ РАЗАМ.
ЗА РОДНЫЯ МЯСЦІНЫ!



СЁННЯ НОЧЧУ, ДЗЕСЬЦІ ПА ЎСЯМУ ГОРАДУ, У КВАТЭРАХ...
... І Ў ЛЮБІМЫХ ПУБЛІЧНЫХ МЕСЦАХ...
... У ДАМАХ ЗА ГОРАДАМ, ДЗЕ ЖЫВУЦЬ НАШЫ БРАТЫ З НЕЧАЛАВЕЧЫМ ВЫГЛЯДАМ...
... ПАДЫМУЦЬ КУФЛІ І ТЫЯ, ХТО НЯ МОЖА БЫЦЬ З НАМІ ТУТ І СЁННЯ, АЛЕ ЯКІЯ ТАКСАМА З'ЯЎЛЯЮЦЦА ГРАМАДЗЯНАМІ ФЭЙБЛТАЎНА І ТАКСАМА ПОЎНЫЯ РАШУЧАСЦІ НІКОЛІ НЕ ЗАБЫВАЦЬ.



ВІТАНКІ, ПІНОКІА! ДАЎНО ЦЯБЕ НЕ БАЧЫЛА.
ПАДАБАЕЦЦА ВЕЧАРЫНКА?
НЕ.
Я САПРАЎДЫ НІКОЛІ НЕ БАЎЛЮ ЧАС ТУТ ДОБРА. НІКОЛІ НЕ БАВІЎ ЧАС ДОБРА НА ГЭТЫМ ТУПЫМ СВЯЦЕ.
ТАДЫ ЧАМУ ТЫ ПРЫХОДЗІШ СЮДЫ КОЖНЫ ГОД?
ТАМУ ШТО РАНЕЙ ЦІ ПАЗНЕЙ ГЭТА БЛАКІТНАЯ ФЕЯ, ЯКАЯ ПЕРАТВАРЫЛА МЯНЕ Ў САПРАЎДНАГА ХЛОПЧЫКА, З'ЯВІЦЦА НА АДНОЙ З ГЭТЫХ ВЕЧАРЫНАК І Я ЗБІРАЮСЯ ДОБРА НАБІЦЬ ЯЕ БЛАКІТНУЮ МОРДУ.
НАВОШТА? Я ДУМАЛА, ШТО ТЫ ЖАДАЎ СТАЦЬ САПРАЎДНЫМ ХЛОПЧЫКАМ?
ВЯДОМА, Я ЖАДАЎ. АЛЕ ХТО ВЕДАЎ, ШТО МНЕ ПРЫЙДЗЕЦЦА ЗАСТАЦЦА ХЛОПЧЫКАМ НАЗАЎСЁДЫ? ГЭТА КУРВА ЗРАЗУМЕЛА МАЁ ЖАДАННЕ ЗАНАДТА ЛІТАРАЛЬНА.
МНЕ ЎЖО БОЛЬШ ТРОХСОТ ГАДОЎ, І Я ЎСЁ ЯШЧЭ НЕ ДАРОСЛЫ Ў ПАЛАВЫМ ПЛАНЕ.
Я ЖАДАЮ ВЫРАСЦІ, ЖАДАЮ, КАБ У МЯНЕ АДРАСЛІ ЯЙКІ, ЖАДАЮ АДПЯРДОЛІЦЦА.



ВЫ, АБОДВА! ХОПІЦЬ НЫЦЬ І ГАЛАСІЦЬ!
АЛЕ МЫ ПРАПУСКАЕМ СВЯТКАВАННІ!
ПАСПРАБУЙЦЕ ЎПІХНУЦЬ У СВАЕ ЧЭРАПЫ, ШТО ВЫ ЗБІРАЕЦЕСЯ ПРАПУСЦІЦЬ НЯ ТОЛЬКІ ГЭТЫ ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ, АЛЕ НАПЭЎНА І СОТНЮ НАСТУПНЫХ.
У МЯНЕ ДАСТАТКОВА НА ВАС АБОДВУХ, КАБ АДАСЛАЦЬ ВАС НА ФЕРМУ НА СТАГОДДЗЕ ПРАЦАТЭРАПІІ.
АЛЕ МАГЧЫМА ЁСЦЬ ДРУГІ ВАРЫЯНТ – ЯК УСЕМ НАМ ПАЗБЕГНУЦЬ ГЭТАЙ СУРОВАЙ НЕАБХОДНАСЦІ.
ХАЛЕРА, БОЗЛІ! ВЯДОМА, СІНЕБАРОД ТВОЙ, ТАМУ ШТО ТЫ СХАПІЎ ЯГО, КАЛІ ЁН КАТАВАЎ МЯНЕ...
ПРЫКРЫЙ ЗЯПУ, ЖАЛАСНАЕ ДЗІЦЁ.
...АЛЕ ТЫ НІЧОГА НА МЯНЕ НЕ МАЕШ... НІЧОГА, ШТО ТЫ МОЖАШ ДАКАЗАЦЬ.
ТЫ БЛІЗКІ ДА ТАГО, КАБ ДАВЕДАЦЦА ДАКЛАДНА, КОЛЬКІ Я МАГУ ДАКАЗАЦЬ. АЛЕ ПАКУЛЬ Я НЕ ГРУКНУЎ МАЛАТКОМ, ВЫ АБОДВА МАЕЦЕ МАГЧЫМАСЦЬ ПАЙСЦІ НА ВЕЧАРЫНКУ – З УМОВАЙ, ШТО ВЫ БУДЗЕЦЕ ТРЫМАЦЦА ДАЛЁКА АДЗІН АД АДНАГО.
СІНЕБАРОД, У ЦЯБЕ ЁСЦЬ ЧАС, КАБ ПРЫВЕСЦІ СЯБЕ Ў ПАРАДАК І ЗРАБІЦЬ ШТОГАДОВЫ УЗНЁСАК У КІШЭНЮ НАШАГА МЭРА... ШТО НАГАДАЕ НАМ, ЯКІ ТЫ САПРАЎДНЫ ГРАМАДЗЯНІН.
І КАЛІ ЛАСКА, ПАКІНЬ ДОМА ЎСЕ КІНЖАЛЫ, НАЖЫ І БАЯВЫЯ СЯКЕРЫ.
А З ТАБОЮ, ДЖЭК, МЫ ПАРАЗМАЎЛЯЕМ КРЫХУ САМ-НАСАМ. ПОТЫМ ТЫ ПАКАЖАШ, ЯКІ ТЫ ПАПЕРАДЖАЛЬНЫ ГРАМАДЗЯНІН. ТЫ ДАСТАВІШ ПАВЕДАМЛЕННЕ АДНАМУ ГОСЦЮ НА ВЕЧАРЫНЦЫ.
А ЧАМУ Б ЦЯБЕ САМАМУ НЕ ВЫКОНВАЦЬ СВАЕ ЗАГАДЫ?



"МАЖЛІВА ТАМУ, ШТО Я ЎЖО ПРАПУСЦІЎ БОЛЬШУЮ ЧАСТКУ ВЕЧАРЫНКІ. АЛЕ ЯШЧЭ БОЛЕЙ,ТАМУ ШТА ГЭТА ТОЕ, ШТО ТАБЕ ПРЫЙДЗЕЦЦА ЗРАБІЦЬ, КАЛІ ТЫ ЖАДАЕШ ЗАХАВАЦЬ СВАБОДУ."
НЕ, НЕ, НЕ! ЗАНАДТА ШМАТ ПАМЕШВАННЯЎ! СОЎСУ ТРЭБА ДАЦЬ КАРАМЕЛІЗАВАЦЦА.
ДЗЕ МАЕ КОРНУЭЛЬСКІЯ КУРЫЦЫ? ХТО ІХ УЗЯЎ?
ЦЫБУЛЯ ШАЛОТ? АЛЕ Ж ТЫ КАЗАЎ РАПАВАТАЯ!
У НАС АМАЛЬ СКОНЧЫЛАСЯ ГУСІНАЯ ПЯЧОНКА. ПАКЛАСЦІ ЯШЧЭ ЦІ...?
МЫ ЎСЁ ЯШЧЭ ПАДАЁМ СУП?
ЛЕПЕЙ ПАКЛАСЦІ ЯШЧЭ ШТОСЬЦІ І ПАХУТЧЭЙ. ГЭТЫ НАТОЎП ЕСЦЬ УСЁ, ШТО БАЧЫЦЬ.
ТЫ ЦІ СПАЗНЯЕШСЯ, ЦІ СПЯШАЕШСЯ! УСЁ ПАВІННА ПАДАВАЦЦА ДАКЛАДНА Ў ЧАС!
Я НАРЭШЦЕ ЗРАБІЎ ГЭТА.
ЗАКУЛІССЕ САМАЙ ВЯЛІКАЙ ПАДЗЕІ ГОДУ.
НЯМ.
ТЫ ЎХОДЗІШ У МЕНЮ?
О БОЖАЧКІ. СПАДЗЯЮСЯ, ШТО НЕ.


ВОСЬ ТЫ ДЗЕ. ВЫГЛЯДАЕШ ЦУДОЎНА.
Я ЎЖО ПАЧАЛА ДУМАЦЬ, ШТО МЯНЕ КІНУЛІ.
НІЧОГА. ТЫ Ж ЗАЎСЁДЫ ХОДЗІШ УСЮДЫ АДНА, ТАК?
ТАМУ ТЫ Б НЕ АДЧУЛА АНІЯКАЙ НЯЁМКАСЦІ, КАЛІ Б Я НАОГУЛ НЕ ПРЫЙШОЎ.
БОЖУХНА, ТЫ ЗУСІМ НЕ МАЕШ ПАЧУЦЦЯ ТАКТУ І ДАЛІКАТНАСЦІ?
НАПЭЎНА. ПАЙШЛІ, НАМ ТРЭБА БЫЦЬ НА ПЛЯЦОЎЦЫ ДЛЯ ТАНЦАЎ.
НАВОШТА?! ГЭТА ДРУГАЯ ЧАСТКА ТВАЁЙ СКЛАДАНАЙ СХЕМЫ, ПА ЯКОЙ ТЫ ЗБІРАЕШСЯ ЗЛАВІЦЬ ЗАБОЙЦУ МАЁЙ СЯСТРЫ?
МАЖЛІВА. ЗАРАЗ, БЭЛА, ПАКАЖЫ, ЯК ГЭТА РОБІЦЦА.
ТЫ РАНЕЙ НІКОЛІ НЕ ТАНЦАВАЎ?
НІКОЛІ.
КЛАДЗІ РУКІ СЮДЫ І СЮДЫ. КРЫХУ ДАЛІКАТНЕЙ, КАЛІ ЛАСКА. Я НЕ НЕЙКІ ПАДАЗРОНЫ, ЯКОГА ТРЭБА СХАПІЦЬ. ЗАРАЗ ІДЗІ ЗА МНОЙ І ПАСПРАБУЙ НЕ НАСТУПАЦЬ НА НОГІ.
ДОБРА, ДАРАГАЯ.


ПАДЫМІ ПОГЛЯД.
ТАДЫ Я НЕ ЗМАГУ БАЧЫЦЬ МАЕ НОГІ.
УСЁ РОЎНА. ВЫГЛЯДАЕ, БЫЦЦАМ БЫ ТЫ ГЛЯДЗІШ У ВЫРАЗ СУКЕНКІ.
І ШТО? НАВОШТА ТАБЕ ТАКІ ГЛЫБОКІ ВЫРАЗ, КАЛІ ТЫ НЕ ЖАДАЕШ, КАБ ЛЮДЗІ ГЛЯДЗЕЛІ?
МАЖЛІВА ЖАНЧЫНЫ НОСЯЦЬ ТАКІ ГЛЫБОКІ ВЫРАЗ, КАБ ПАДЗЯЛІЦЬ ДЖЭНТЭЛЬМЕНАЎ І САБАК. ТЫЯ, ХТО ЎСЁ ЯШЧЭ ГЛЯДЗЯЦЬ У ВОЧЫ, НАВАТ ПРЫ ТАКІХ ГРУДЗЯХ,
МАГЧЫМА МАЮЦЬ НЕКАТОРЫ ПАТЭНЦЫЯЛ.
ГАЎ.
АЙ, САЧЫ ЗА СВАІМІ НАГАМІ.
АЛЕ ТЫ ТОЛЬКІ ШТО КАЗАЛА НЕ САЧЫЦЬ ЗА НАГАМІ.
АХ, ГЭТА ТВОЙ КАВАЛЕР, ПРЫНЦЭСА?
БЕДНАЯ ДЗЯЎЧЫНКА.
НЕ ТРЭБА ЛІТАРАЛЬНА САЧЫЦЬ ЗА НАГАМІ. ПРОСТА, КАЛІ ЛАСКА, НЕ ТАПЧЫСЯ ПА МАІМ.
ЗРАЗУМЕЎ. КОЛЬКІ ГЭТЫМ ТРЭБА ЗАЙМАЦЦА, ПЕРАД ТЫМ ЯК МЫ ЗМОЖАМ ПАЕСЦІ?
СПАДАР ВОЎК, ДОБРА РУХАЕЦЕСЯ!
НЕ ГЛЯДЗІ НА МЯНЕ. ТАНЧЫЦЬ БЫЛО ТВАЁЙ ІДЭЯЙ.
ВЕЛЬМІ ДРЭННАЙ ІДЭЯ. Я І НЕ ЧАКАЎ, ШТО БУДУ...
...У ЦЭНТРЫ ТАКОЙ УВАГІ.
САПРАЎДЫ ПОЙДЗЕМ ПАЯМО АБО ВЫП'ЕМ. ДАВАЙ БУДЗЕМ РАБІЦЬ ШТО ЗАЎГОДНА, АБЫ НЕ ТАНЧЫЦЬ!
ДОБРА, АЛЕ ТЫ ПРЫЙШОЎ ВЕЛЬМІ ПОЗНА. БОЛЬШУЮ ЧАСТКУ ЕЖЫ З'ЕЛІ.
АЛЕ НЕ ХВАЛЮЙСЯ.
Я ВЕТЭРАН У ГЭТАЙ СПРАВЕ.
І Я ПРЫСВЯЧУ ЦЯБЕ Ў ВЯЛІКУЮ ТАЯМНІЦУ. АБСЛУГА ЗАЎСЁДЫ КРАДЗЕ ЛЕПШАЕ З ДЭЛІКАТЭСАЎ ДЛЯ СЯБЕ.
ЯНЫ ТРЫМАЮЦЬ ДОБРАЕ Ў ЗАЧЫНЕНЫХ ЗАДНІХ ПАМЯШКАННЯХ. А ПОТЫМ ПАСЛЯ ВЕЧАРЫНКІ
НЯСУЦЬ ДАДОМУ.



КАЛІ ЖАДАЕШ, МОЖАМ ЗАБЕГЧЫ НА КУХНЮ І ПРЫМУСІЦЬ ГЭТЫХ ПІРАТАЎ ЗДАСЦІ ЧАСТКУ НАВАРАВАНАГА - НА АБЯЦАННЕ, ШТО МЫ ПРА НІХ НЕ РАСПАВЯДЗЁМ.
ВОСЬ ЯНО.
ШТО ЯНО?
ЗАРАЗ ТЫ ЗНАЙШЛА АПОШНЮЮ ЧАСТКУ ЗАГАДКІ, ЯКАЯ ВЕЛЬМІ НАДАКУЧЫЛА.
САПРАЎДЫ?
САПРАЎДЫ. РУЖА ЛЮБІЛА ВЕСЯЛІЦЦА! ЛЮДЗІ - ЗВЫЧАЙНЫЯ І ЧАРАЎНІКІ - УВЕСЬ ЧАС ПРЫХОДЗІЛІ І СЫХОДЗІЛІ З ЯЕ КВАТЭРЫ, НАВАТ КАЛІ ЯЕ НЕ БЫЛО. ЯНА ПАСТАВІЛА НАВАТ ЗАМОК НА ЛЯДОЎНЮ, КАБ НІЧОГА НЕ ПАКРАЛІ.
ПАКУЛЬ Я ЦЯБЕ НЕ РАЗУМЕЮ.
ГЭТА НЕ БЫЛО САПАЎДЫ ІСТОТНЫМ, АЛЕ ГЭТА БЫЎ АДЗІНЫ ЭЛЕМЕНТ ГАЛАВАЛОМКІ, ЯКІ АДСУТНІЧАЎ ДАГЭТУЛЬ. ЗАРАЗ УСЁ СКОНЧАНА.
ЖАДАЕШ ДАВЕДАЦЦА, ХТО ЗАБІЎ РУЖАНЬКУ?
ВЯДОМА!
ПУСЦІ ЧУТКУ, ТОЛЬКІ ЦІХЕНЬКА.... НЯХАЙ УСЕ, КАМУ ЦІКАВА, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ І ХТО ГЭТА ЗРАБІЎ, ПАДЫМУЦЦА НА ТЭРАСУ КАРАЛЯ КОЎЛА. .. АДРАЗУ ПАСЛЯ РОЗЫГРЫШУ ЛАТЭРЭІ.


І ВЫЙГРАЎ НУМАР...
А ЯГО МІЛАСЦЬ ВЕДАЕ, ШТО ХОДЗІШ СЮДЫ ПЛАВАЦЬ, КАЛІ ЯГО НЯМА?
А ХТО ВЕДАЕ?
КАЛІ ЁН ВЕДАЕ, ТО ЁН НІКОЛІ НЕ СКАРДЗІЎСЯ.
НЕ СУПРАЦЬ, КАЛІ Я ВАЗЬМУ ЦЫГАРЭТКУ?
ДУМАЮ, НЕ.
СКОНЧЫЎ СА СВАІМІ ДАРУЧЭННЯМІ, ДЖЭК?
ПРЫНЦ ДЖЭК ДЛЯ ЦЯБЕ, ПРАСТАЧЫНА.
НЕ... НЕ КАЖЫ МНЕ...
АГА... Я ВЫЙГРАЎ ГЭТУ ЛАТЭРЭЮ... А ЎСЯГО АДЗІН КВІТОК КУПІЎ.


ЦІ ГЭТА НЕ УДАР ПА ЯЙКАМ? Я ЎСЁ СВАЁ ЖЫЦЦЁ КАРЫСТАЎСЯ РОЗНЫМІ СХЕМАМІ, КАБ ЧАГОСЬЦІ ДАСЯГНУЦЬ. А ЎСЁ, ШТО МНЕ БЫЛО ТРЭБА - ПРОСТА КУПІЦЬ КВІТОК.
ШКАДА, ШТО ЎСЁ ГЭТА БЕССЭНСОЎНА.
ТАК, МЫ ЎСЕ БУДЗЕМ МАРЫЦЬ ПРА ТОЙ ДЗЕНЬ, КАЛІ ПАБ'ЕМ ВОРАГА І ВЫКІНЕМ ЯГО З НАШЫХ СТАРЫХ ЗЯМЕЛЬ... У ТЫМ ЛІКУ СТАРЫХ НОВЫХ ЗЯМЕЛЬ... АЛЕ УСЯЛЯКІ, АКРАМЯ РАМАНТЫЧНЫХ ДУРНЯЎ, ВЕДАЕ, ШТО ГЭТАГА НІКОЛІ НЕ АДБУДЗЕЦЦА.
ГАТОВЫ ПАЧЫНАЦЬ ШОЎ? ЗДАЕЦЦА, "ВЁСКА" ПРЫЙШЛА.
ПРОСТА КАЖЫ СВАЮ РЭПЛІКУ "ВАША МІЛАСЦЬ".
ВОСЬ І ЯНА - "СЦЭНА Ў ГАСЦІНАЙ", ДЗЕ РАЗУМНЫ ДЭТЭКТЫЎ УСЁ ТЛУМАЧЫЦЬ.
КАЛІ Б ГЭТА БЫЛО МАСТАЦКІМ ТВОРАМ - ТУТ АЎТАР СПЫНІЎСЯ Б І ЗАПЫТАЎСЯ Ў ЧЫТАЧОЎ, ЦІ СКЛАЛІ ЯНЫ ЎСЕ ПАДКАЗКІ.
ОХ, ПРАЦЯГВАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, МАЛАДЫ ЧАЛАВЕК.
ПРАБАЧЦЕ МЯНЕ, АЛЕ КОЖНЫ КОП МАРЫЦЬ ПРА ТАКІ МОМАНТ. АЛЕ НЯШМАТ ХТО МОЖА ДАЧАКАЦЦА ТАКОГА МОМАНТУ. ПАПЕСЦІЦЕ МЯНЕ, КАЛІ ЛАСКА.



ДЖЭК, ЦІ НЕ ЗАПРОСІШ ЗЛОДЗЕЯ ДАЛУЧЫЦЦА ДА НАС?
ВЯДОМА, ВАША МІЛАСЦЬ.
ЯЕ ЗАБОЙЦА ТУТ?
ТАК. Я ПАДАЗРАВАЎ, ШТО ЗАБОЙЦА НЕ ЗМОЖА АДМОВІЦЬ СЯБЕ Ў НАВЕДВАННІ НАШАГА ШТОГАДОВАГА БАЛЮ І Я ПАПРАСІЎДЖЭКА ПАШУКАЦЬ ЯЕ СЯРОД ГАСЦЕЙ.
ЯЕ?
КАГО?
НАМ ТРЭБА РАБІЦЬ ГЭТА?
АБАВЯЗКОВА.
СПАДАРСТВА, ДАЗВОЛЬЦЕ ПРАДСТАВІЦЬ ВАМ ЗАБОЙЦУ РУЖАНЬКІ...


РУЖАНЬКА.
ЯК, ХАЛЕРА ДЗЯРЫ?
Я ПАТРАБУЮ ПАЯСНЕННЯЎ!
ЯК ТЫ ГЭТА ЗРАБІЛА?!
РУЖА!
ТАМ БЫЛО СТОЛЬКІ КРЫВІ!
ЯКУЮ НАМ ДАВЯЛОСЯ ПРЫБІРАЦЬ!
РУЖА, НАВОШТА ТЫ ЗРАБІЛА ГЭТА?
РАСЛЕДВАННЕ!
КАЛІ ЦЯБЕ НЕ ЗАБІЛІ, ТО...
ПА АДНАМУ!
КАЛІ ВЫ ЎСЕ ВЕРНЕЦЕСЯ НА СВАЕ МЕСЦЫ.
СЕЛІ, ДУРНІ!
ДЗЯЎЧО ЎСЯГО ТОЛЬКІ ПАВЯРНУЛАСЯ З МЁРТВЫХ.
ЯК... ЧАМУ МЫ ТЫ ПРЫМУСІЛА НАС ПРАЙСЦІ ПРАЗ УСЁ ГЭТА?
ГЭТА НЕ МАЯ ВІНА!
УСЕ! СУПАКОЙЦЕСЯ НА ХВІЛІНУ І СПЫНІЦЕ РАЗМОВЫ...
Я РАСПАВЯДУ - ШТО ЯНА ЗРАБІЛА, ЯК ЯНА ЗРАБІЛА І ЧАМУ ЯНА ГЭТА ЗРАБІЛА.
ДАЛЕЙ: ВЯЛІКАЕ ВЫЯЎЛЕННЕ!